# Адукацыйнае падарожжа ў свет прафесій «Дай лапу, сябар!»

**А. У. Данілішына,**
намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст»
СШ №12 г. Пінска

Адукацыйны працэс у сучаснай школе накіраваны на гарманічнае развіццё асобы вучня, здольнай прымяняць атрыманыя ва ўстанове адукацыі веды ў розных жыццёвых сітуацыях. Асабліва актуальным становіцца пытанне самавызначэння ў прафесіі. Таму ў кантэксце сучасных патрабаванняў важнай задачай з'яўляецца фарміраванне запатрабаваных кампетэнцый у вучняў. У новых вучэбных праграмах акрэслены прадметныя кампетэнцыі: літаратурная, каштоўнасна-светапоглядная, культуралагічная, культуратворчая, маўленчая і камунікатыўная.

У практыцы выкладання беларускай мовы і літаратуры кампетэнтнасны падыход рэалізуецца рознымі спосабамі, а падчас работы ў інавацыйным праекце ўзнікла магчымасць фарміравання здольнасцей заўважаць і аналізаваць вучэбны матэрыял як аснову для выбару будучай прафесіі. Пра актуальнасць праблемы выбару прафесіі сведчыць суб'ектыўны вопыт вучняў. У сувязі з гэтым паўстае пытанне выбару эфектыўных сродкаў для фарміравання патрэбных кампетэнцый вучняў. Сярод такіх сродкаў самыя эфектыўныя метады – інтэрактыўныя. Да іх можна аднесці канструктыўна новы метад – педагагічнае суправаджэнне ў адукацыйным падарожжы. Гэта не проста інтэрактыў, гэта новы від адукацыйнай камунікацыі, заснаваны на навыку самастойнага стварэння сваёй уласнай сістэты пошуку патрэбнай інфармацыі. Пошук гэты ажыццяўляецца самімі вучнямі.

Да вызначэння сутнасці камунікатыўнай кампетэнцыі ў педагагічнай літаратуры існуюць розныя падыходы:

1) паводле азначэння І. А. Зімняй, гэта валоданне складанымі камунікатыўнымі навыкамі і ўменнямі, фарміраванне адэкватных уменняў у новых сацыяльных структурах, веданне культурных норм і абмежаванняў у зносінах, звычаяў, традыцый, этыкету ў сферы зносін, выхаванасць, арыентацыя ў моўных сродках;

2) А. В. Хутарскі вызначае сутнасць камунікатыўнай кампетэнцыі ў дзейнаснай форме: валодаць спосабамі ўзаемадзеяння з рознымі людзьмі і падзеямі; выступаць з вусным паведамленнем, умець задаць пытанне, карэктна весці вучэбны дыялог; валодаць рознымі відамі маўленчай дзейнасці (маналог, дыялог, чытанне, пісьмо), лінгвістычнай і моўнай кампетэнцыямі; валодаць спосабамі сумеснай дзейнасці ў групе, прыёмамі дзеянняў у сітуацыі зносін, уменнямі шукаць і знаходзіць кампрамісы; мець пазітыўныя навыкі зносін у грамадстве, заснаваныя на веданні гістарычных каранёў і нацыянальных традыцый.

Пры гэтым істотна, што камунікатыўная кампетэнцыя на ўроках і за яго межамі фарміруецца ў адзінстве з іншымі кампетэнцыямі.

Фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі ў працэсе рэалізацыі адукацыйнага падарожжа адбываецца паэтапна і па розных напрамках:

1) колькаснае назапашванне (павелічэнне слоўнікавага запасу, аб’ёму выказвання);

2) якасныя змены (вымаўленне, развіццё звязнага маўлення, разуменне звернутага да вучня маўлення, уменне арыентавацца і кантактаваць ў бытавых, прафесійных умовах).

Ёсць розныя падыходы да вызначэння этапаў фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі. Я прапаную сістэму работы па фарміраванні камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў 5–6 класаў, абапіраючыся на педагагічны эксперымент, вучэбную праграму па беларускай мове і літаратуры, уласныя назіранні, вучнёўскі вопыт.

Работа ў праекце «Укараненне мадэлі фарміравання прафесійнага самавызначэння вучняў сродкамі тэхналогіі адукацыйнага падарожжа» пачалася з абмеркавання з вучнямі тых прафесій, якія вядомы кожнаму дзяцяці. Потым я папрасіла расказаць пра прафесіі бацькоў ці родных, якія некалі саміх вучняў здзівілі, прымусілі задумацца пра свой выбар прафесіі. Такія размовы праводзіла першы месяц работы і рабіла нататкі для асабістых размоў, пошуку новых шляхоў і выкарыстання на ўроках мовы і літаратуры. Калі вывучалі праграмныя творы па літаратуры ці выконвалі практыкаванні па мове, то шукала такія зачэпкі, якія дазволілі б мне і вучням абмеркаваць нешта важнае і цікавае для канкрэтнага класа і канкрэтных вучняў. У нас атрымалася некалькі адукацыйных падарожжаў. Паколькі мэтай маёй настаўніцкай работы было выкарыстанне новых спосабаў фарміравання камунікатыўных кампетэнцый, то апорай сталі непасрэдныя камунікацыі і абмеркаванне з вучнямі працэсу пошуку, абагульнення і аналізу, граматнага афармлення сабранага матэрыялу.

Так склалася адукацыйнае падарожжа **«Дай лапу, сябар!»**

Аповесць Максіма Лужаніна «Добры хлопец Дзік» (5 клас, беларуская літаратура) падштурхнула да вывучэння сітуацыі ў нашым горадзе. І мне, і вучням стала цікава

вызначыць, што мы ведаем пра прафесіі, звязаныя з сабакамі (і іншымі жывёламі) увогуле. Структура работы такая, як і ва ўсіх праектах:

I этап – **мэтавызначэнне** (абмеркавалі мэты і задачы вывучэння прафесій);

II этап – **праектаванне** (дамовіліся аб змесце работы ў групах, распрацавалі індывідуальныя і групавыя маршрутныя лісты; прызначылі адказных за выкананне і тых, хто будзе дапамагаць з боку дарослых);

III этап – **рэалізацыйны** (вызначылі часавыя межы над работай і спосабы даследавання);

Ivэтап – **прэзентацыя** групавога ці ўласнага даследавання;

V этап – **аналітыка-рэфлексійны** (выслухалі кожную групу, абмеркавалі пачутае, зрабілі вывады аб магчымасці самарэалізацыі ў названых прафесіях).

У класе вучні (і іх бацькі) па ўласным жаданні разбіліся на 5 груп.

**1. «Сабачая прыгажосць»**

Дзеці вывучылі пароды сабак і іх характарыстыкі, гісторыю іх узнікнення; вывучылі адрасы цырульняў (грумераў) для сабак у Пінску, даследавалі кошт сабачай стрыжкі, асаблівасці навучання гэтай пафесіі, узялі інтэрв'ю ў грумера, сфатаграфаваліся і былі здзіўлены матэрыяльныму укладу ў прыватную справу (навучанне ў Пінскім аграрна-тэхнічным каледжы або ў акадэміі па спецыяльнасці «Ветэрынарны ўрач», набыццё спецыяльных сродкаў – шампунь, кандыцыянер, спецыяльныя нажніцы і г.д.), здзіўлены складанасцямі ў такой рабоце не толькі з самімі сабачкамі, але і з патрабавальнымі гаспадарамі і многаму яшчэ. Работу афармілі ў выглядзе карты-даведкі.

**2. «Арыентацыя – выгул!»**

Дзеці даследавалі колькасць месцаў для выгулу сабак, склалі карту Пінска з пазнакамі, дзе дапускаецца выгул; даследавалі прафесію «Дрэсіроўшчык сабак», вывучылі асаблівасці трэніроўкі сабакі-павадыра (школа №12 знаходзіцца ў раёне для людзей са слабым зрокам, вучні бачаць такіх сабак штодня), вывучылі прафесіі, якія звязаны з выкарыстаннем сабак, наведалі адпаведныя арганізацыі, узялі інтэрв'ю ў прадстаўнікоў прафесій, сфатаграфаваліся і расказвалі пра складанасці і радасці такіх прафесій вучням класа.

**3. «Ветдапамога»**

Дзеці знайшлі ўсе адрасы ветэрынарнай дапамогі, заамагазінаў, распыталі ўладароў і прадаўцоў пра асаблівасці іх прафесіі. Склалі карту-памятку з адрасамі, нумарамі тэлефонаў, паметкамі аб паслугах.

**4. «Наш рэальны нерэальны Пінск»**

Вучні прааналізавалі і падабралі матэрыял, які зацікавіць не толькі гасцей горада, але і саміх Пінчукоў.

1. Кафэ «Хот-дог» – гэта кафэ для гаспадароў сабак і для тых, хто жадае паспрабаваць сябе ў якасці валанцёра. Вучні наведалі кафэ і ўзялі інтэрв'ю ў арганізатараў. Даведаліся пра незвычайны шлях стварэння, тэлебатл за гран-пры на тэлеканале «Беларусь-1», рэалізацыю і існаванне незвычайнага кафэ.

2. Дзіцячы садок для шчанюкоў. І гэта ёсць у Пінску. Туды можна аддаць сабачку, калі гаспадар мае ў гэтым патрэбу. Дзеці з'ездзілі да арганізатараў, усё ўбачылі на ўласныя вочы, выгулялі сабачак, даведаліся пра ідэю і расказалі пра ўсё ў класе, склалі буклет.

**5. «Фантастыка і мары»**

Дзеці натхніліся маім расповедам пра бібліятэку ў Фінляндыі, у якой сабакі дапамагаюць дзецям вучыцца чытаць. На ўроку літаратуры я пазнаёміла з незвычайнымі фактамі пра сабак, вучні зацікавіліся і афармілі свае ўласныя фантазіі і мары ў асобны фантастычны маршрут. Склалі свой буклет «Пінск ў маіх фантазіях», дзе апісалі свае магчымыя будучыя прафесіі, у якіх ніяк не абысціся без жывёл: тэатр з сабакамі; яслі-сад «Праменьчык» (для ўсіх маленькіх жывёл, чые гаспадары едуць у камандзіроўку); пінская бібліятэка з сабакамі + правілы паводзін у такой бібліятэцы; басейн з сабакамі + правілы паводзін у такім басейне.

**Вывад**: дзеці вывучылі пералічаныя прафесіі, прайшлі праз рэальнае і фантастычнае падарожжа, абмеркавалі цяжкасці і складанасці розных прафесій, прыдумалі новыя прафесіі для шчаслівага суіснавання чалавека і жывёл у нашым горадзе. Выканана мэта – створаны ўмовы для фарміравання камунікатыўных кампетэнцый вучняў на ўроках беларускай мова і літаратуры (і за межамі ўрокаў, за межамі школы), праведзена вялікая работа па фарміраванні навыкаў прафесійнай арыентацыі.